*М.А.Бяспалая*

# ДУХОЎНЫ ЎЗДЫМ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: ВЫТОКІ І ВЫНІКІ

Адна з самых таямнічых і трагічных сацыякультурных з'яў ва ўсёй гісторыі чалавецтва – гэта вайна. Як пісаў Л.М.Талстой, вайна – гэта «… противное человеческому разуму и всей человеческой природе событие, в период которого миллионы людей совершали друг против друга такое бесчисленное количество злодеяний… и на которые, в этот период времени, люди, совершавшие их, не смотрели как на преступления».

Мільёны людзей аказаліся ўцягнутымі ў вайну, якая нечакана пачалася 22 чэрвеня 1941 г. і прычыны якой многія не зусім разумелі. Тым больш, што ўжо амаль два гады ва ўсіх сродках масавай інфармацыі гаварылася аб дружбе з Германіяй. У народзе нават склалася прымаўка: "Наш закляты сябра–фашысцкая Германія". Шмат напісана аб непадрыхтаванасці да вайны, шмат вядома аб трагедыі першых яе месяцаў, і таму яшчэ больш актуалізуецца праблема аб вытоках перамогі над ворагам.

Безумоўна, няма падстаў, ні навуковых, ні маральных, тлумачыць перамогу толькі як вынік высокага патрыятычнага ўздыму, які ахапіў большасць грамадства і быў абумоўлены, галоўным чынам, кіруючай роляй партыі і перавагамі савецкай сістэмы. Неабходна звярнуць увагу на той факт, што ў складаны ваенны час партыя і дзяржава ў пошуках аб'яднальнага фактару былі вымушаны звярнуцца да вытокаў народнай духоўнасці, да гераічных старонак мінулага, да рэлігійных пачуццяў народа. Некаторыя выказваюцца і так, што мэты і жаданні партыі, дзяржавы і народа супалі, і гэтая акалічнасць стымулявала масавы гераізм на фронце і ў тыле і патрыятычныя пачуцці нават сярод учарашніх ворагаў савецкай улады. Супрацьпаставіць патрыятызм савецкіх людзей нацысцкай ідэі аб перавазе германскай нацыі (арыйскай расы) дапамагалі мараль, духоўныя каштоўнасці, нацыянальная свядомасць нашага народа.

Патрыятызм як складаючая духоўнага жыцця любога соцыуму і асобы фарміруецца ў працэсе гістарычнага развіцця кожнай нацыі, і галоўная сутнасць яго заключаецца ў любові да сваёй малой і вялікай Радзімы. Такое разуменне патрыятызму развівалі ў сваіх

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

працах многія беларускія мысліцелі. Напрыклад, Ф.Скарына як яркі прыклад вернасці сваёй радзіме разглядаў подзвіг Юдзіф у імя выратавання свайго горада, таму што чалавек дзеля айчыны не шкадуе ні "всякого тружания и скарбовъ", "ни живота своего".

Лічым, што самая супярэчлівая праблема заключаецца ў тым, чаму ў час вайны, калі людзі забіваюць адзін аднаго, адбываецца відавочны духоўны ўздым, адбіткам якога з'яўляецца мастацкая культура. Аб гэтым сведчаць творы "Вайна і мір" Л.М.Талстога, "Бывай, зброя" Э.Хэмінгуэя, "Тры таварышы", "На Заходнім фронце без перамен" Э.М.Рэмарка... Можа, ёсць сэнс далучыцца да пункту гледжання Д.Юма, што "вайна… даючы новыя тэмы мастацтву і літаратуры, з лішкам папаўняе неспакой, які прычынены музам". Гэта ж думка выказана і ў сцвярджэнні Геракліта, што падчас вайны адбываюцца барацьба і адзінства супрацьлегласцей.

На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва любая краіна ў цяжкія для яе гадзіны абапіралася на патрыятычныя пачуцці народа. З гэтай мэтай кіраўнікі звярталіся да глыбінных крыніц народнай свядомасці, прапагандавалі подзвігі ў імя Радзімы. Успомнім антычныя паданні аб подзвігах трохсот спартанцаў ці Муцыя Сцэволы, рымскія трыумфы і еўрапейскую традыцыю ўзнагарод і ўшанавання пераможцаў і інш.

У гэтым кірунку дзейнічала і савецкае кіраўніцтва. Аб гэтым сведчаць увядзенне ордэнаў Суворава I, II і III ступені, Кутузава I, II і III ступені, Ушакова I і II ступені, Нахімава I і II ступені і іншых, прысваенне ганаровых званняў воінскім злучэнням і правядзенне артылерыйскіх салютаў у Маскве ў гонар тых палкоў, дывізій і армій, якія вызначыліся пры вызваленні буйных гарадоў.

Тое, што ў гады небяспекі савецкае грамадства было адзіным, сведчаць адсутнасць масавага здрадніцтва, у асноўным адмоўныя адносіны да калабарацыі, высокі патрыятычны ўздым народа. Мабыць, меў рацыю Г.Гегель, калі пісаў, што нацыі знаходзяцца ў стане ўнутранага спакою, дзякуючы знешнім войнам. Аналіз асноўных падзей Вялікай Айчыннай вайны пацвярджае высокі духоўны ўздым у тагачасным грамадстве, які праявіўся ў гераізме салдат і партызан, у патрыятызме асноўнай масы насельніцтва і знайшоў сваё адлюстраванне ў розных відах мастацкай творчасці.

Не апошняя роля ў фарміраванні патрыятычнага настрою грамадства належала творчай інтэлігенцыі. Менавіта яе прадстаўнікі афармілі патрыятычны парыў народа ў трагічна-

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ўрачыстых гуках "Свяшчэннай вайны", плакаце "Радзіма–маці кліча!", выступленнях у прэсе і па радыё, рэпартажах з дзеючай арміі і партызанскіх злучэнняў.

Вытокі духоўнасці, якая праявілася з першых дзён вайны, трэба шукаць перш за ўсё ў патрыятызме людзей і іх глыбокай любові да Радзімы. Успомнім унікальны подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці, які, на нашу думку, не мае аналагаў у гісторыі вайны. Невялікая група салдат і афіцэраў, падлеткаў і жанчын, без боепрыпасаў, ежы і вады змагалася ў акружэнні ворагаў. Паміраючы, яны пісалі на сценах: "Бывай, Радзіма! Паміраю, але не здаюся", – што сведчыла аб вышэйшым праяўленні духоўнасці. Такія ж пачуцці натхнялі мільёны тых, хто абараняў подступы да Мінска, Барысава, Магілёва, а потым Ленінграда, Масквы, Кіева, Адэсы, Севастопаля і Сталінграда. Успомнім дакументальныя кадры адной з серый "Вялікая Айчынная", што прысвечаны подзвігам у тыле і расказваюць аб жанчынах, якія змаглі перанесці голад, холад, эвакуацыю, развітанне з блізкімі, нават смерць дзяцей. Немагчыма застацца абыякавым пры знаёмстве з веліччу іх подзвігу.

Безумоўна, арганізацыя партызанскага і падпольнага руху таксама сведчыць аб патрыятызме яго ўдзельнікаў. Прадстаўнікі розных сацыяльных і ўзроставых груп, нацыянальнасцей прымалі ў ім удзел. Іх аб'ядноўвалі любоў да Айчыны, жаданне абараніць і вызваліць яе ад чужынцаў як мага хутчэй, няўспрыманне чужой культуры.

Нельга пакінуць без увагі той высокі творчы ўздым, які адбываўся ў гады вайны ва ўсіх відах мастацтва. Безумоўна, стварэнне музычных, літаратурных твораў, твораў выяўленчага мастацтва ў гады цяжкіх выпрабаванняў, імкненне франтавікоў да мастацтва і сустрэчны рух творчай інтэлігенцыі (гастролі тэатральных, музычных калектываў у дзеючай арміі, навукова-папулярная і культурна-асветніцкая работа музеяў, бібліятэк, прыезд пісьменнікаў і паэтаў да франтавікоў і інш.) з'яўляюцца адной з цікавых старонак культурнага жыцця ў часы вайны.

Спецыялісты часта карыстаюцца матэрыяламі аб гастролях франтавых брыгад у дзеючай арміі. Больш за месяц, з 5 чэрвеня па 23 ліпеня 1943 г., знаходзілася на фронце брыгада І Беларускага драмтэатра. За гэты час артысты далі 72 спектаклі і 73 канцэрты салдатам і афіцэрам. Праграма ўключала спектакль "Скупы" па п'есе Мальера, выступленні двух дэкламатараў,

струннага квартэта, вакальнага квінтэта, якія выконвалі беларускія народныя песні і музыку. Аб дзейнасці гэтай брыгады ў фондах Белдзяржмузея гісторыі вайны захавалася шмат дакументаў. Яны раскрываюць высокі патрыятычны ўздым, які ўзнікаў у час выступленняў артыстаў. У адной справаздачы аб рабоце франтавой брыгады сказана: “Быў выпадак, які мы не зможам забыць ніколі, калі 3000 аўдыторыя, узняўшы над галавой зброю, дала клятву вызваліць родную Беларусь”.

Вядома, што падчас вайны ў імя адзінства грамадства ўлады пачалі звяртацца да рэлігійных пачуццяў народа. Кіраўніцтва Маскоўскай патрыярхіі лічыла, што сваёй расавай тэорыяй фашызм прынцыпова варожы хрысціянству. Кіраўнік рускай праваслаўнай царквы заклікаў суайчыннікаў да непрымірымай барацьбы з захопнікамі, да збору сродкаў на абарону. На сродкі вернікаў была пабудавана танкавая калона “Дмитрий Донской”. Як вядома, за патрыятычную дзейнасць патрыярх быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды і многія святары.

Акупацыйныя ўлады не звярталі належнай увагі на пачуцці веруючых, асабліва пасля пералому ў ходзе вайны, аддаўшы гэтае пытанне на водкуп царкоўнай калабарацыі. Вядомы выпадкі, калі людзі знішчаліся ў царкве, як у в.Малая Плотніца Палескай вобласці, в.Жыдча Пінскага раёна, в.Доры Валожынскага раёна і інш. Толькі ў Палескай епархіі колькасць цэркваў за гады акупацыі паменшылася амаль на 37 %, а колькасць святароў больш чым на палову, некаторыя з іх, як, напрыклад, У.Назарэўскі, А.Валасовіч і іншыя, былі расстраляны.

Такім чынам, высокі духоўны ўздым, які сфарміраваўся ў савецкім грамадстве ў гады Вялікай Айчыннай вайны, меў адным са сваіх вытокаў глыбокі патрыятызм і любоў да Радзімы, а вынікам яго стала перамога савецкага народа. Мабыць, меў рацыю паэт, які вобразна ахарактарызаваў сілу, што перамагла карычневую чуму, як “сяло, якое вызваліла Еўропу”. Духоўны настрой салдат і афіцэраў, а яны ў большасці сваёй былі вяскоўцамі, фарміраваўся на аснове спрадвечных пачуццяў да сваёй малой і вялікай Радзімы, што выразна праявіўся ў масавым гераізме як на фронце, так і ў савецкім і варожым тылах.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ